Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6)
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

ПРАЦА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 1 Вільня, Субота 5-га лістапада 1927 г. Год I

Да чаго ідзе?

Адказ на гэтае пытаньне дае нам без сумляваньня дэклярацыя аб'яднаных манархістаў. Дагэтуль партыі і групы, якія паддзержвалі ўрад Пілсудскага, не выстаўлялі яўна сваей сацыяльна-палітычнай праграмы, крычучы толькі аб маральнай санацыі. Цяпер аднак дэклярацыя манархістаў, якія зьяўляюцца, без сумляваньня, найбольш урадовай партыяй, аб чым сьведчаць пастановы зьездаў у Несьвіжы, Дзікаве і Ябланове і іх рэзалюцыі „поўнага даверра да намераў Маршалка Пілсудскага", адкрыта выяўляе ўсю паўнату сацыяльна-палітычнае праграмы ўсей маральнай санацыі і самаго ўраду.

Што-ж кажа гэтая дэклярацыя найбольш урадовай партыі?

Першае—на полі палітычным. Спалохаўшыся магутнага ўзросту сьвядомасьці і арганізаванасьці масаў, ня веручы ў магчымасьці панаваньня над імі шляхам дэмократыі, аб'яднаныя манархісты, а разам з імі тым самым і маршалак Пілсудскі, адкрыта ставяць сваей мэтай адмену ўсеагульнага, роўнага, тайнага і г. д. выбарнага права. Але і гэтага ім здаецца замала. Яны адкрыта кажуць аб зьмене наагул ўсіх падставовых пунктаў канстытуцыі. Іхнім дамаганьнем зьяўляецца пэўнае ўхіленьне ад парлямантарызму навет пры зьмененных ужо выбарных правох. Улада галавы дзяржавы пашыраецца. Не ад парляманту, а ад яго мае быць залежным лёс ураду.

Да ўсяго гэтага, як падстава, павінны быць дастасаваны і самаўрады. І тут працоўныя масы павінны быць пазбаўлены магчымасьці тым-ж адняцьцем выбарных правоў легальным шляхам бараніць свае інтарэсы.

Не абмінуты ў гэтай праграме і нацыянальнае пытаньне, гэтая балячка польскай дзяржавы. Ясна, што аб самавызначэньні народаў няма тут і гутаркі. Не, бачыце—тут—наадварот выразна гаворыцца, што толькі „польскі народ, які стварыў дзяржаву, павінен мець магчымасьць кіраваньня яе (дзяржавы) лёсам". З гэтага падкрэсьленьня правоў польскага народу як-бы само сабой выцякае, што нацыянальныя меншасьці пазбаўляюцца навет права ўплываць на лёсы дзяржавы, у якую яны так ці інакш уціснуты, ня кажучы ўжо аб самавызначэньні. Ім толькі велікадушна дазваляюць разьвіваць сваю культуру, але і то ў пэўных межах. Уся праграма зводзіцца да таго, што „разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомасьці ў пляменьняў, адвеку цягнучыхся да польскай культуры, не павінна адбывацца *штучна ані са шкодай для польскага элемэнту на крэсах*".

Вось у галоўных рысах палітычны ідэал ураду Пілсудскага, да якога ён імкнецца супольна з усімі прымыкаючымі да яго палітычнымі групамі і партыямі.

Цяпер — другое — сацыяльна-эканамічная праграма ўсяе санацыі. „Маючы,—бачыце—на мэце падняць заможнасьць і жыцьцёвы ўзровень найшырэйшых кругоў народу". Праграма аб'яднаных манархістаў бачыць асновы нармальнага эканамічнага разьвіцьця ў захаваньні падставаў і ненарушнасьці „прыватнай уласнасьці ўмяркаванага індывідуалізму—салідарнасьці клясаў і прафэсіяў". Вось-жа палепшаньне дабрабыту і павышэньне жыцьцёвага ўзроўня шырокіх працоўных мас павінна пайсьці шляхам салідарнасьці іх з капіталістамі і абшарнікамі! Клясавая барацьба, бачыце, тут лішняя! Абшарнікі і капіталісты самі паклапацяцца аб палепшаньні быту работнікаў. Так і сказана навет у другім месцы, што „дзяржава павінна ведаць, што багацьце капіталу і разьвіцьцё мясцовых прадпрыемстваў прыносіць сабою куды большае забясьпечаньне работніцкіх інтарэсаў, чым усялякая праўная абарона". Значыць—бясправўныя палітычна і пазбаўленыя ўсялякай юрыдычнай абароны — работнікі будуць чуцца куды лепш, бо ў варунках гэтага бяспраўя паны-капіталісты, бачыце, зьменяцца і пачнуць клапаціцца аб сваей бясправўнай скаціне. Гэткім шляхам мае наступіць палепшаньне дабрабыту і жыцьцёвага ўзроўню работніцкіх мас па праграме санацыі! Вось галоўныя пункты ў работніцкім пытаньні. Пасьля гэтага зусім лішне застанаўлівацца на тых проста дэмагагічных, няшчырых абяцаньнях палепшаньня дабрабыту работніцкіх мас.

Пару слоў яшчэ аб аграрнай частцы сац.-эканамічнай праграмы. Тут, бязумоўна — спыненьне ўсялякай парцэляцыі, і разьвіцьцё абшарніцкай гаспадаркі і г. д. Аграрная рэформа павінна запасьці ў Лету забыцьця. А гэтым шляхам мае быць палепшаны дабрабыт і ўзьняты жыцьцёвы ўзровень сялянства! Запраўды, чудовая праграма!

Ясна, што правядзеньне такой чудовай праграмы можна забясьпечыць толькі шляхам поўнага абяспраўленьня, адсуненьня ад палітычнага жыцьця шырокіх працоўных мас, а таксама і шляхам поўнага духовага іх закабаленьня. І гэтага не забыліся сказаць у сваей праграме ўрадовая партыя паноў-манархістаў, аб чым выразна гаворыць культурна-асьветная яе частка. Засобам гэтага поўнага духоўнага закабаленьня працоўных мас па гэтай праграме зьяўляецца поўная клерыкалізацыя ўсяе асьветы. „Дзеяльнасьць касьцёлу на поле выхаваньня зьяўляецца яўнай для ўсіх неабходнасьцяй, а дабрадзейны ўплыў рэлігійнага духу на дзяржаўна-палітычнае і грамадзкае жыцьцё *варункам выхаду з труднасьцяў сучаснай эпохі* і забясьпячэньне неабходных маральных падстаў для жыцьця ўсяго народу"—ад сябе скажам—для правядзеньня свайго чудовага эканамічнага і палітычнага пляну.

Вось да чаго ідзе!

Ідзе да поўнага палітычнага, нацыянальнага, сацыяльнага, эканамічнага і духовага закабаленьня мас. Да гэтага імкнуцца ўсе групы маральнай санацыі на чале з яе ўрадам!

Аднак ніхто яшчэ ня стрымаў непераможнага бегу гісторыі. Ніхто не задушыць і не загасіць прабуджанай сьвядомасьці мас. Наадварот, гэтая спроба, гэты рэжым расчыніць толькі вочы яшчэ і тым масам, якія жывуць ілюзіямі сучаснай дэмакратыі, гэтая спроба толькі прысьпешыць у канечным вывадзе самы бег гісторыі.

„Głos Prawdy" аб польска-савецкіх адносінах.

У 295 нумары ўрадовага „Głosu Prawdy" зьявілася перадавіца галоўнага рэдактара Стпічынскага аб польска-савецкіх адносінах пад загалоўкам „Чаго хочаце: Міру і добрых адносін, ці непаразуменьняў і ненавісьці?" Стацьця напісана з прычыны прамовы Затонскага, старшыні цэнтр. кантрольнай камісіі кам. партыі, сказанай на другой сэсіі Усеўкраінскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Зьезду Саветаў у Харкаве.

У гэтай прамове „Głos Prawdy" бачыць пярэчаньне таму становішчу, якое заняў у сваім афіцыяльным інтэрв'ю ў Варшаве пасол Саветаў Багамолаў. Стпічынскі заяўляе, што прамова Затонскага зьяўляецца недапушчальнай у варунках добрых і прыязных адносін да СССР., што сумляваньні ў сувэраннасьці польскай палітыкі зьяўляецца абразай для Польшчы і польскага грамадзянства. Таксама недапушчальным для гэтых адносін зьяўляецца ўжываньне праз адказных савецкіх палітыкаў імені Польшчы ў сувязі з плянамі іншых дзяржаў супроць Саветаў і прыпісываньне Польшчы ваенных замыслаў супроць саветаў. На пагляд „Głosu Prawdy" гэта ўсе робіць немагчымым вядзеньне прац над пактам аб неагрэсіі (ненападаньні) і іншымі ўмовамі. Навет прысутнасьць польскага пасла ў гэтых варунках становіцца абразьлівым для годнасьці польскага Народа і дзяржавы.

Калі Саветы ня прымуць гэтага да ведама, дык няма аб чым і гутарыць. Або так, або не. „Трэцяй магчымасьці няма", канчае сваю перадавіцу Стпічынскі.

У гэтым-жа нумары, зьмешчаны і тыя мейсцы з прамовы Затонскага, якія выклікалі абурэньне „Głosu Prawdy".

Перадрукоўваем даслоўна паводлуг „Głosu Prawdy" гэтую амаль поўную прамову Затонскага:

Англія парвала з намі. Таксама сарвалі з намі ўмову і правадыры прафруху ангельскага і пашлі за сваей буржуазіяй. Ня гледзячы на гэта, сымпатыі англійскіх рабочых, мы пэўны ў тым,—на нашым баку.

Буржуазія ангельская будзе перадусім нацкоўваць тыя дзяржавы, якіх можна павясьці на вайну, г. зн. тыя дзяржавы, у каторых рабочая кляса — невялікая і рабочы рух ня вельмі разьвіты. Маю на мэце дзяржавы сельска-гаспадарчыя, як Румынія, Польшча і г. д., іменна нашых суседзяў.

У гэных дзяржавах, ведама, большасьць грамадзянства складае сялянства, улада знаходзіцца ў руках буржуазіі, а ў Польшчы—у руках фашыстаў, праводзячы дэмагогічную палітыку, згрупоўваючы навокал сябе ўсе буржуазныя часткі ў першай чарзе — дробную буржуазію, якая лятуціць аб стварэньні Вялікай Польшчы. Польшча запраўды знаходзіцца цяпер у імпасе, бо ляжыць паміж магутнай у прамысловым значэньні Нямеччынай і СССР. Польшча не жадае запэўніць сваё існаваньне мірным шляхам; буржуазія лятуціць аб вялікай Польшчы ў граніцах 1772 года. Але было гэта вельмі даўно, многа вады ўцякло; многа рэчаў зьмянілася на сьвеце, а лятуценьні пэўнай часткі польскіх нацыяналістых застаюцца гэткімі самымі і дагэтуль. Польшча ёсьць краем, ведама, сялянскім, каторы можна было-бы прымусіць пайсьці на вайну, бо сялянства польскае — распарушана, не асьвядомлена і можа стацца адпаведным матар'ялам для гарматнага мяса. Вось, чаму нашы заядлыя ворагі зварачваюць вялікую ўвагу ў сучасны мамэнт на Польшчу. Сумліўна, ці Чэмбэрлен сам пашле дрэдноўты (вялікія ваенныя караблі) да нашых мораў, ён будзе нацкоўваць пілсудчыкаў, тым больш, што самі гэтага жадаюць. У гэтым палягае сэнс польскага фашызму, што ён гатуецца да вайны супраць СССР. Мы вайны ня хочам, ні адзін раз прапанавалі нашым суседзям у тэй лічбе і Польшчы, зусім дагодныя для іх варункі, прапанавалі ўтрымліваньне мірных гандлёвых адносін, каторыя бязумоўна адрадзілі-б польскія прамысловыя цэнтры, як Лодзь, Беласток і г. д., меўшыя некаліcь у нас рынак збыту для сваіх вырабаў. Але яны супраціўныя нашым мірным адносінам. Ня можам зачыняць вачэй, ня можам ня бачыць гэтага, што робіцца, ня можам ня бачыць гэтых транспартаў, каторыя перапраўляюцца беспасярэдне праз Балтыцкае мора да Польшчы, ня можам ня бачыць гэтага рыхтаваньня да вайны, каторае праводзіцца, тым больш, што яны з гэтым зусім ня крыюцца. Газэты сьмела пішуць аб граніцах з 1772 г., адкрыта заяўляюць, што трэба вызваліць Украіну з пад маскоўскай улады. На нас, на Харкаў, апэтыты іх не пашыраюцца, не хапае ім адвагі; але ўзрокі іх скіраваны на правае пабярэжжа з Кіевам, а мо' і на Чорнае мора з Адэсаю, вось над чым яны ўздыхаюць. Гутарка йдзе аб вызваленьні Украіны з пад Масквы. Цікава сачыць за тэй работай, якую вядуць нашы суседзі, ведама, на ўкраінскіх землях.

Ведаеце грамадзяне, што заграніцаю ёсьць звыш 8 мільёнаў украінскага грамадзянства пад панаваньнем Польшчы і Румыніі, а нат' Чэхаславакіі. Толькі да Чэхаў далёка, а аб Румыніі ня варта нат' і гаварыць; можа яна быць толькі папіхачам — і нічым больш — у барацьбе, каторая супраць нас гатуецца. Найважнейшым ёсьць наш заходні сусед — фашыстаўская Польшча. Нядаўна бачылі мы нячуваныя перасьледаваньні ў Польшчы ўсяго, што ўкраінскае. Як некалі цар называў Украіну—Маларосіяй, так і ўрад польскі называе Галіцыю „Малапольскай".

Цар цьвярдзіў, што няма ніякіх украінцаў, а ёсьць папросту маларусы, там таксама гаворана — няма ніякіх украінцаў, усе ёсьць толькі русінамі, каторых павінна спалёнізаваць. Усё, што ўкраінскае, здушана і яшчэ як здушана! У гэтым краю пад аўстрыйскай уладаю мажліва было культурна-нацыянальнае разьвіцьцё, былі свае школы, нат' унівэрсытэт, а пад Польшчай усё гэта зьнішчана. Цяпер пачынаюць, як быццам рабіць уступкі. Апошнія весткі гавораць, што ўрад Пілсудскага ўвёў у кожнай сярэдняй польскай школе выклады ўкраінскае мовы. Гэта ўжо ёсьць пазычана з нашага дэкрэту. У нас на Украіне ў кожнай школцы вучаць абавязкава ўкраінскай мовы. Даны дазвол таксама на адчыненьне некалькіх, зусім украінскіх школ, на Валыні адчынена некалькі ўкраінскіх гімназіяў.

Аддаюцца ім цяпер пэўныя маемасьці; будынкі былых украінскіх грамадзкіх арганізацыяў зноў варочаюцца да ўкраінскіх арганізацыяў. Некатарых украінскіх дзеячоў паклікана на ўрадавую службу і бачым, што частка ўкраінскай буржуазіі аддае свае ўслугі польскаму фашызму. На банкеце, нядаўна выданым у Львове польскім ваяводай, былі ўжо прысутнымі прадстаўнікі ўкраінскага грамадзянства, каторыя перад гэтым байкатавалі ўсё, што польскае, а пэўней — не яны байкатавалі, а іх не запрашалі.

Цяпер прышлі яны, гатовыя да згоды, баючыся ўзросту рэвалюцыйных настрояў. Бачаць яны, што ў нас адраджаецца рабоча-сялянская культура, што ўзрастае ўлада ня толькі ўкраінская, але і савецкая, што тут пануе дыктатура пралетар'яту, кіруючая сялянствам і вядучая яго да сацыялізму. Добра яны аб гэтым ведаюць і дзеля гэтага гатовы прадаць народныя інтарэсы для забясьпечэньня сваіх клясовых інтарэсаў. Бачым цяпер, як украінскія нацыяналістыя на Захадзе йдуць на ўгоду з пілсудчыкамі і гэта павінна быць для нас перасьцярогай.

Мы павіны быць асьцярожны. На ўкраінскіх землях праводзіцца шалёная агітацыя супроць Радавай Украіны.

Зазначыўшы далей, колькі фальшывых вестак аб Радавай Украіне можна чытаць у ўкраінскай прэсе, што выходзіць у Малапольшчы, Затонскі сказаў: „Распаўсюджваецца ідэя аб'яднанай буржуазнай Украіны, незалежнай ад рэвалюцыі. Разумеецца, што гэта аб'яднаная Украіна ніколі ня можа быць самастойнай і незалежнай ад буржуазіі, яна мусіла-б няўхільна стацца калёніяй капіталу. А ў першу чаргу дасталася б яна пад ярмо польскага фашызму. Фашысты гатовыя аддаць Украіну польскім магнатам. Яны хочуць з іх дапамогай прыйсьці сюды на Украіну і дзеля гэтага крычаць аб вялікай аб'яднанай Украіне. Мы таксама перакананы, што ў сваім часе будзе існаваць вялікая аб'яднаная Украіна, каторая зьбярэ ўсе ўкраінскія землі. Мы таксама перакананы, што прыйдзе гэта з дапамогай Польшчы, але якое Польшчы? Ня можа быць аднак аб'яднанае Украіны без рэвалюцыі ў Польшчы, без перамогі польскай рабочай клясы ў самай Польшчы.

Калі перамогуць у Польшчы работнікі, дык вельмі лёгка прыйдзем да згоды з імі ўва ўсіх пытаньнях і тады запраўды можна будзе аб'яднаць усе ўкраінскія землі.

Украінскія нацыянал-угадоўцы думаюць аб чымсь іншым. Прагнуць яны прыйсьці сюды пры дапамозе польскае буржуазіі па адданьню ёй Заходняй Украіне. Земляроб польскі не асьвечаны, не асьвядомлены—з аднаго боку, а земляроб ўкраінскі, каторага хочуць ашукаць, з другога,—вось іх стаўка. Яны лічаць, што сяляне польскія і ўкраінскія будуць гарматным мясам падчас тэй бруднай гульні, каторую вядзе прадстаўніца сусьветнага капіталу—англійская буржуазія".

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Бюджэт.

У Сойм зложаны ўжо бюджэт на час ад 1. IV. 1928 г. да 31. III.—1929 г. Выдаткі прадбачацца ў вышыні—2.228,9 мільёнаў зл., даходы—2.350 мільёнаў. Надвышка прыходаў над выдаткамі гэткім чынам раўняецца 121 мільёну. У параўнаньні з мінулым бюджэтам—даход павялічваецца на 230 мільёнаў. З гэтай падвышкі—70 мільёнаў ідзе на амортызацыю (пагашэньне доўгу) і працэнты. Апрача таго, павялічана на 30 мільёнаў бюджэт міністэрства публічных работ.

Паасобныя пазыцыі выглядаюць наступным чынам:

1) Прэзыдэнт — 1,754.000 зл. 2) Сойм і Сэнат—9,199.000 зл. 3) Дзяржаўны Кангроль—4,677.000 зл. 4) Прэзыдыум Рады Міністраў—1,872.000 зл. 5) Міністэр. Замежных Спраў — 48,129,000 зл. **6) Міністэрства Вайск. Спраў — 689.419,000 зл. 7) Міністэрства Унутран. Спраў—211.179,000 зл. 8) Міністэр. Скарбу—110 959,000 зл. 9) Міністэрства Справядл. — 101,922.000 зл.** 10) Міністэрства Прамысловасьці і гандлю — 38,065.000 зл. 11) Мін. Шляхоў Зносін — 3.971,000 зл. 12) Міністэрства Земляробства—39,068,000 зл. 13) Мін. Асьветы і Рэлігіі — 341.842,000 зл. 14) Мін. Публічных Работ — 108,005.000 зл. 15) Мін. Працы і Грам. Апекі—56.772,000 зл. 16) Мін. Зям. Рэформы — 42.066,000 зл. 17) Мін. Почт і Тэлеграфаў — 1.893.000 зл. 18) Эмэрытуры — 87.217,000 зл. 19) Інвалідзкія рэнты — 101.618,000 зл. 20) Дзяржаўныя даўгі—204.794 000 зл.

На пакрыцьцё бюджэту галоўныя крыніцы даходу наступныя:

1) Падаткі беспасярэднія — 1.178,6 мільёнаў зл. 2) Падаткі ўкосныя (манаполі) — 783,9 мільён. зл. (манаполь спірытусовы і табачны—на 360 мільёнаў, рэшта прыпадае на іншыя). У іншых даходах фігуруюць таксама і Дзяржаўныя Чыгункі, якія павінны па бюджэту прынясьці чыстага даходу—80 мільёнаў зл., пакрываючы, апрача таго, усе найважнейшыя выдаткі на інвэстыцыю (рэмонты, будовы і г. д.).

Гэткім чынам мы бачым, што выдаткі на войска раўняюцца прыблізна 30 працэнт., выдаткі на паліцыю і адміністрацыю (211 мільёнаў), а на Мін. Справядлівасьці — 102 мільёны.

На жаль, у прэсе яшчэ не паданы весткі, скольki з прызнаных 341 мільён. на Міністэрства Асьветы і Рэлігіяў запраўды прыпадае на народную асьвету.

Аб чым пяе палкоўнік Славэк на абшарніцкіх зьездах.

Вельмі цікавыя і цэнныя інфармацыі зьмяшчае ў гэтай справе „Gazeta Warszawska". Разьбіраючы прычыны нябывалых пасьпехаў палкоўніка Славка, гэтых „аднагалосных прыняцьцяў сярод незмаўкаючых апладысмэнтаў" рэзалюцыі „поўнага даверыя да намераў маршалка Пілсудскага", „Gazeta Warszawska" цьвердзіць, што пасьпехі гэтыя дасягаюцца наступнымі запэўненьнямі: „Запэўненьнем, што марш. Пілсудскі разгоніць наступны Сойм, створыць новы дзяржаўны лад, забясьпечваючы цалком край ад партыйнай дэмагогіі, сацыяльных заварушаньняў; лад далёкі ад усякіх дэмакратычных звычаяў і нораваў, у каторым клясы абшарнікаў і капіталістаў будуць магчы спакойна глядзець у будучыну без баязьні якіх-небудзь зямельных і сацыяльных рэформаў, затрымоўваючых разьвіцьцё вытворчасьці і руйнуючых дабрабыт абшарнікаў і прамыслоўцаў. Аснаўной умовай, аднак, зьяўляецца, каб абшарніцтва і буйная прамысловасьць парвалі ўсялякія палітычныя адносіны з сучаснай апазіцыяй, а перадусім з эндэцыяй, каб сталі на старану сучаснага ўраду, каб самастойна арганізаваліся на выбары без агляду на з пэўны правал, бо—лёс будучага Сойму акрэсьлены ўжо зараз". Ад сябе дадамо, што паданы „Газэтай Варшаўскай" кароткі зьмест песень пал. Славка зьяўляецца больш чым праўдападобным. Што да значэньня гэтых песень, дык камэнтары тут лішнія. Яно ясна само па сабе.

Новая ўнутраньняя пазыка.

Польская прэса паведамляе аб новай унутраньняй пазыцы. У міністэрстве фінансаў распрацоўваецца ўжо праект распараджэньня прэзыдэнта Рэчыпасп. у гэтай справе.

Пазыка ў вышыне 100 мільён. зл. мае быць скіравана перадусім на будаўніцтва і будзе выпушчацца сэрыямі. Пазыка мае быць 7 працэнтнай і пагашана ў працягу 25 год.

Праект зьнясеньня неадклікальнасьці судзьдзяў.

Прэзыдыум Галоўнай Управы Саюзу Судзьдзяў і Пракурораў Рэчып. Польск. паведамляе:

У зьвязку з адбыўшымся паседжаньнем Галоўнай Управы Саюзу Судзьдзяў і Пракурораў была прынята п. п. міністрам справядлівасьці Мэйштовічам і віцэміністрам Царам дэлегацыя ў справе знаходзячагася ў апрацоўцы праекту новага судовага ладу. Дэлегацыя складалася з прадстаўнікоў усіх вобласьцей. У дапаўненьне да папярэдня зложаных мэмарыялаў, абгаварываліся некатарыя прынцыповыя справы, зьвязаныя з увядзеньнем рэарганізацыяй суда.

Дэлегацыя выказала перадусім пажаданьне, каб арганізацыйны пэрыяд, у працягу якога мела-бы быць спынена неадклікальнасьць і непераносчасьць судзьдзяў, быў-бы скарочаны да некалькіх месяцаў (праект прадбачыць для судоў I інстанцыі 2 гады, для II інстанцыі год). Затым падчыркнута, што на становішча ў судзе належыць вызначаць выключна асоб, маючых поўныя нармальныя кваліфікацыі (праект прадбачыць пэўныя адхіленьні ад гэтага прынцыпа).

Быў выказаны пагляд, што пры назначэньнях і павышэньнях на судовых становішчах падставай назначэньняў павінны быць апініі судоў аб кандыдатах, бо гэтым спосабам унікнецца з аднаго боку протэкцыянізм, з другога—забясьпечыцца пры назначэньнях міністра справядлівасьці ад заўсёды магчымых палітычных уплываў.

Як пан міністар Мэйштовіч, гэтак і віцэміністар Цар, адзначаючы, што ў арганізацыйным пэрыядзе пэўныя асабістыя пераноскі будуць неабходны, запэўнілі аднак, што адказныя чыньнікі ня маюць намеру выкарыстаць гэты пэрыяд для націскаў на суд, бо толькі рэчовыя пагляды будуць рашаючымі.

Іншыя справы ня былі яшчэ канчальна аформлены.

Як бачым, паны Мэйштовіч нічога не адказалі, з аднаго боку на дамаганьне назначаць судзьдзяў толькі з поўнымі кваліфікацыямі, з другога на зьмяншэньне пэрыяду пераносчасьці судзьдзяў. Відаць, што на 2-гадовым пэрыядзе з „рэчовых" аглядаў і застанецца.

Трэба дадаць яшчэ, што незьмяняльнасьць і непераносчасьць судзьдзяў з займанага становішча загарантавана ў Канстытуцыі.

Арыштаваньне 74 маладых работнікаў і вучняў у Кракаве.

Падчас жыдоўскага „Суднага дня" група вольнамысьлячай жыдоўскай моладзі Кракава зрабіла экскурсыю за места. Па некім часе, калі экскурсанты елі, на палянку выскачыў аддзел паліцыі і за падобную антырэлігійную (?!) дэманстрацыю (па рытуалу ў гэты дзень ня можна есьці) заарыштавала 74 асобы.

Тры галадоўкі ў працягу тыдня.

У працягу няпоўнага тыдня змушаны былі зрабіць галадоўкі палітычныя вязьні ў турмах Берасьця, Кракава і Львова.

Справа рухомых пэнсыяў ўрадоўцам.

На зьездзе дзяржаўных і самаўрадовых урадоўцаў была паднята справа рухомых, у залежнасьці ад узросту дарагавізны, пэнсыяў. Прысутны на гэтым зьездзе Бартэль станоўча выступіў супроць гэтага пажаданьня, матывуючы свае адмоўнае становішча напружанай фінансавай і гаспадарчай сітуацыяй.

Развал Пяста.

Развал Пяста не абмяжаваўся адным выхадам сэнатара Бойкі. Гэта быў толькі пачатак. Паводлуг апошніх вестак, да Бойкі далучаюцца наступныя паслы і сэнатары: Срэдняўскі, Блыскош, Косыдарскі, Едынак, Масьлянка, Кавальчук, Домброўскі. Паслы гэтыя маюцца апублікаваць у справе свайго выхада асобную заяву.

Блёк нацыянальных меншасьцяў.

Жыдоўскі „Nasz Przegląd" падае ў суботнім нумары наступны поўафіцыяльны камунікат: „Справа блёку нацыянальных меншасьцяў не спаткала жадных перашкод; істнуюць толькі некаторыя разыходжаньні ў справе пэўных фармальнасьцяў (падзел пасольскіх мандатаў Рэд.). З мамэнтам абвешчаньня выбараў у Сойм і Сэнат, усе дагаварыўшыяся партыі афіцыяльна прыступяць да Блёку".

Заграніцай.

Справа ратыфікацыі трактату з ССРР ў латвійскім Сойме.

26 кастрычніка ў латвійскім Сойме прадаўжалася дыскусія ў справе зацьверджаньня падпісанага ўрадам таргова трактату з ССРР.

Міністар Целенс, які веў усю працу перагавораў з Радамі, сказаў вялікую прамову ў абарону трактату. Трактат з Радамі, як з найважнейшым рынкам для латвійскай прамысловасьці, павінен быць заключаны. Бо-ж бяз гэтага Латвія ня будзе мець добрага таргова балянсу, а значыць і нармальнай раўнавагі свайго бюджэту. Наагул—трактат—вельмі карысны для краю, які — ня толькі атрымае ад радавага ўрад значныя замовы на тавары, але, апроч таго, з ССРР пройдзе праз латвійскія парты 200.000 тоннаў вывазных тавараў-транзытам. (За транзыт—чыгункай ці праз порт — ведама-ж бярэцца значная плата). Міністар запэўняе апазіцыю, што заключэньне трактату з ССРР ня выкліча ніякіх непаразуменьняў у гаспадарчых стасунках з суседнімі дзяржавамі і зусім не перашкодзіць правядзеньню ў жыцьцё навет—„мытнага аб'яднаньня" Латвіі з Эстоніяй, аб якім ідуць перагаворы з урадам апошняй.

Пасьля мін. Целенса прамаўляў пас. Ульманіс,—з пункту гледж. земляробаў—павадыр Сялянскага Саюзу, які баяўся, што трактат з сельска-гаспадарчым перад усім ССРР—у абмен за прамысловыя тавары — зальле Латвію сваім танным хлебам дый іншымі выробамі сельскай гаспадаркі, робячы гэтым цяжкую канкурэнцыю для латвійскага хлебароба... Дык гэта можа наагул пашкодзіць гаспадарчаму разьвіцьцю краю—ў вялікшай сваей частцы—земляробскага.

Павадыр „нацыянальнай правіцы" Бэргс, які баяўся ўжо больш небясьпекаў, якія выкліча камуністычная прапаганда новай радавай пляцоўкі ў краі—лічнай торговай дэлегацыі ССРР.

Другі аратар Сялянскага Саюзу выражаў страх, каб трактат з Радамі не зашкодзіў рэалізацыі саюзу Балтыцкіх дзяржаў.

Як ведама, трактат з Радамі зацьверджаны латвійскім Соймам, праўда—ня вельмі значнай большасьцяй галасоў.

Англія імсьціцца Латвіі—за трактат з ССРР.

Англійскія газэты вельмі нездаволены—рашучай перамогай радавых уплываў у Латвіі, якія знайшлі свае выражэньне—у зацьверджаньні латвійскім Соймам трактату з Радамі. Газэты вельмі сумуюць з гэтай прычыны—перадусім дзеля таго, што трактат з Радамі — „зрабіў немагчымым стварэньне Балтыцкага блёку дзяржаваў"—ведама-ж — скіраванага проці ССРР, аб чым так лятуцела, кідаючы на гэта вялізарныя грошы, англійская палітыка...—„блёкады ССРР", а можа і якой далей ідучай авантуры...

Раздражненая прэса паведамляе, што — у зьвязку з апошнім „варожым да Англіі"(...) крокам Латвіі, яе ўраду закамунікавана, каб яна не спадзявалася больш ніякай пазыкі на англійскім грашовым рынку...

Пэўна-ж латвійскі ўрад знаў, што рабіў. — Праўда, Латвіі патрэбны англійскія крэдыты, але выгады ды карысьці таргова паразуменьня з Радамі — настолькі вялікія пэўне-ж радавы ўрад не паскупіўся на ўступкі, каб дабіцца ў Латвіі над Англіяй перамогі, якая мае для яго, апрача гаспадарчага, вялізарнае палітычнае значэньне, што яны далёка перавышаюць карысьці ды выгады тымчасовай „англійскай прыязьні", пабудаванай перадусім — на непрыязьні да ССРР... Наскольki можна судзіць з газэтных вестак, радава-латвійскі трактат запраўды-ж папросту — „выжывае" Англію — англійскія ўплывы і англійскія тавары з Латвіі, інакш кажучы—б'е Англію ня толькі па носе, але і па кішані... А гэтага апошняга „горды брытт", як ведама, ня зносіць, мо' навет горш, як першага... Адсюль і—зразумелая помста...

Уражаньне ў Фінляндыі.

Ратыфікацыя трактату з Радамі латвійскім Соймам зрабіла вялікае ўражаньне ў-ва ўсіх Балтыцкіх дзяржавах. Пасьля Фінляндыі Латвія — найвялікшая з балтыцкіх дзяржаваў, паўстаўшых на тэрыторыі былой Расеі, ня кажучы аб Польшчы. Дык ясна, які магутны ўплыў павінен зрабіць рашучы крок Латвіі на Эстонію і Літву. Але Фінляндыя залічае сябе да іншай групы дзяржаў Скандынаўскай групы, якая наагул больш зьлёжана да Нямеччыны і Англіі. Прэса Фінляндыі, праўда, пераважна правая, востра выступае проці латвійскага паразуменьня з Радамі, даводзячы, што гэты крок Латвіі ёсьць актам самазабойчым, які робіць з яе—„васала Радавай Расеі".

Фінляндзкі ўрад з свайго боку пакульшто толькі асьцярожна заявіў, што заява латвійскага міністра заграпічных спраў у парляманьце, быццам яму ведама, — ад Фінляндзкага яго калегі, што Фінляндыя нічога ня мае проці радава-латвійскага трактату, — не адказывае праўдзе: фінляндзкі міністар замежных справаў такой заявы латвійскаму не рабіў...

Нямеччына дае адшкадаваньні сваім грамадзянам за ваенныя страты.

Нямецкія ўлады апрацавалі праект закону, паводле якога маюць выплачвацца значныя адшкадаваньні ўсім нямецкім грамадзянам за страты, прычыненыя ім ваеннымі падзеямі. Стаўкі адшкадаваньняў падзелены на групы так, што—страты, ацэненыя да сумы 5 тысяч марак будуць выплачаны цалком; да 15 тысяч. — толькі ўжо на тры чэцьвярці ўсей сумы; далейшыя 10.000 будуць пакрыты толькі на палову; ад 25 да 200 тыс. страты будуць пакрыты на 40 прац.

Нямецкі ўрад—ізноў „адлажыў на пасьля" справу перагавораў з Польшчай.

Орган нямецкіх сацыялістаў „Наперад" абураецца на тое, што нямецкі ўрад — пад націскам правіцы (нацыяналістаў абшарнікаў) ізноў адлажыў разгляд справы ўзнаўленьня перагавораў з Польшчай у справе гаспадарчага трактату. Ужо нямецкі ўрад быццам пастанавіў — паведаміць нямецкага пасла ў

Ул. Короленко.

Судны дзень.

(*Іом-Кіпур*)

(Украінская казка).

Пераклала Вера Грыц.

> Агонь затух, а месяц усходзіць, у лясу пасецца ваўкалак.
>
> (Шэўчэнка).

— Вось, што, Гаўрылка,—сказаў, усё ж такі ласкавым голасам млынар, — ідзі ляж спаць са мною. Калі чалавек бачыў тое, што бачыў я, дык бярэ страх.

— А мне што? Магу і легчы.

Праз якую-небудзь хвіліну падсыпка пачаў ужо сьвістаць носам. А трэба вам ведаць, што такога сьвістуна носам, як гэты падсыпка, другога ніхто нідзе ня бачыў. Хто гэтага ня любіць, дык няхай не лажыцца з ім у аднэй хаце, усю ноч не засьне.

— Гаўрыла, — азваўся млынар, — эй, Гаўрыла!

— Чаго яшчэ? Чаму гэта я сам сплю і другім не перашкаджаю?

— Білі цябе ізноў?

— Ну, дык што-ж?

— Дзе?

— Усё вам трэба ведаць. У Кодне!

— Ужо і ў Кодне?.. Чаго гэта цябе туды насіла?

— Чаго... На што б я пытаў, гы-гы-гы!..

— Мала табе нова-каменскіх дзяўчат?!

— Цьфу! Я на іх і глядзець ужо не хачу. Ні аднэй няма прыгожай.

— А ўдавіна Галя?

— Галя... А што-ж гэта такое Галя?

— А ты да яе хадзіў?

— Дык няўжо-ж не?

Млынара падкінула на ложку.

— Брэшаш, сабачы сын, трасца тваёй мацеры!

— Вось-жа і не брашу, і я ніколі не брашу. Няхай за мяне разумныя брэшуць.
Падсыпка пазяхнуў і сказаў сонным голасам:

— Памятуеце, гаспадар, як у мяне на ўвесь тыдзень запухла правае вока, што і ня было відно...

— Ну?..

— Яна гэта, сабачая дачка, так пачаставала... Цьфу на яе, вось што!.. А то яшчэ: Галя!

„Хіба што так", — падумаў млынар. — Гаўрыла, а Гаўрыла!.. Вось, сабачы сын, зноў сьвішча... Гаўрыла!

— Яшчэ што? Загарэлася нешта?

— Хочаш жаніцца?

— Яшчэ не пашыў сабе ботаў. Вось спраўлю, тагды і падумаю.

— Я-бы табе справіў боты на дзёгцю... І шапку, і пояс.

— Хіба, што так. Але я вось вам нешта скажу, дык гэта і будзе разумней.

— А што?

— А тое, што ўжо на вёсцы пяюць пятухі... Чуеце, як заводзяць?

І праўда! у вёсцы, можа нават у Галінай хаце, крычаў-надрываўся галасісты пятух: ка-ка-рэ-ку-у...

— Как-ка-рэ-ку-у... ка-а... ку-у! адказываліся да яго на розныя галасы і блізкія і далёкія, з другога канца вёскі, так што ад пятушынага крыку нібы ў катле кіпела, ды ўжо і ў сьценах каморы пабялелі, усе, навет самыя малыя шчыліны.

Млынар салодка пазяхнуў:

— Ну, яны цяпер далёка! Успамінай, як называлі Янкеля... Вось штука, дык штука! Калі пра гэта каму-небудзь расказаць, дык, навет, брахуном ахрысьцяць. Ды мне аб гэтым навет ня варта і ўспамінаць. Яшчэ скажуць, што я... Эй, ды аб чым тут разважаць! Калі-б я сам забіў жыда, ці што небудзь — іншае, а я тут нічога. Ці трэба было мне лезьці ў гэтую справу? Мая хата з краю, я нічога ня знаю. Еш пірог з грыбамі, а трымай язык за зубамі; дурны крычыць, а разумны маўчыць... Вось я сабе і маўчаў!...

Так гаварыў з сабою млынар Піліп, каб было лягчэй на сумленьні, і толькі тады, калі ўжо саўсім пачаў драмаць, з нейкага кутка яго сэрца выпаўзла, як жаба з нары, гэткая думка:

— Ну, Піліп, прышло тваё панаваньне!

Гэтая думка прагнала з яго галавы ўсе іншыя і запанавала там. З тым і заснуў.

VII.

Вось раненька раніцаю, раса яшчэ на траве блішчыць, а млынар ужо прыбраўся і йдзе па дарозе ў вёску. Прыходзіць у вёску, а людзі ўжо там снуюць, ак мурашкі ў муравейніку: „Эй! ня чулі вы навіну. Замест карчмара Янкеля, з места прывезьлі толькі патынкі".

Якіх толькі ня было гутарак тою раніцаю ў Новай-Каменцы, ды такі ня мала і граха!

Удава Янкеля, атрымаўшы, замест мужа, пару патынкоў, зусім спужалася і ня ведала што рабіць. Ды да гэтага яшчэ Янкель, з вялікага розуму, не спадзяючыся, што яго забярэ Хапун, забраў з сабою ў места ўсе грошы і ўсе вэксалі з капшуком. Ведама, ці-ж мог бедны жыд спадзявацца, што з цэлага кагалу схопіць якраз яго?

— Гэтак заўсёды чалавек: ня чуе, не варожыць, што над ім няшчасьце, як той Хапун, лятае,—гаварылі сабе грамадзкія людзі, ківаючы галавамі і расходзячыся ад карчмы, гдзе маладая жыдоўка з сваімі бахурамі білася аб зямлю і рвала на сабе валасы. А, паміж тым, кажды сам сабе думаў: „Напэўна, і мой вэксаль паляцеў цяпер да чорта на кулічкі!"

Праўду сказаць, дык ня вельмі многа знайшлося ў грамадзе такіх людзей, у якіх загаварыла-б трохі суменьне: „а ня грэх такі было-б аддаць жыдоўцы, калі не з працэнтамі, дык хоць чыстыя грошы"... А калі ўжо сказаць цалком усю праўду — дык ніхто не аддаў навет зломанага граша...

Не аддаў і млынар. Але млынар сябе ня лічыў.

Янкелева ўдава прасіла, плакала, валялася ў нагах, каб панове — грамадзяне згадзіліся аддаць хоць па паўрубля за рубель, хоць па дваццаць грошай, каб ім усім сіратам не падохнуць з голаду, ды як небудзь давалачыся да места. І не ў аднаго такі гаспадара з добрым сэрцам па вусам цяклі сьлёзы, а часам хто — небудзь штурхаў такі локцям суседа:

Варшаве, каб запрапанаваў польскаму ўраду безадкладнае распачацьце перагавораў. Усё было ужо падрыхтавана—для канчальнай пастановы ўраду. Але—у апошні мамэнт міністры-нацыяналісты ізноў — зьнялі з чаргі справу, якая цягнецца ўжо тры гады.

Справа загранічнай пазыкі Літве.

У Лёндане сядзіць літоўскі генерал, пасланы ўрадам дзеля заключэньня пазыкі. Пазыку мае даць Англія, ці англійскія банкі. Але банкі трэбуюць, каб літоўскі ўрад даў за пазыку так званыя „гарантыі“, гэта-ж значыць папросту—„заставіў“ ім, пакінуў у іх руках пэўныя вартасьці — з дзяржаўных маемасьцяў ці даходаў Літвы. Перагаворы быццам ужо падыйшлі да канца, толькі літоўскі ўрад не згаджаецца заставіць Англіі—даходы з мытаў ды транзыту, добра разумеючы, што гэтым ён сам кладзе рашуча цяжкую англійскую руку на ўсю заграничную—гаспадарчую і іншую—палітыку Літвы.—Бо-ж заставіўшы (аддаўшы ў „застаў“, ці „залог“) мытныя ды транзытныя даходы Англіі, Літва—пад націскам падвойным: ня толькі палітычным, але і фінансава-гаспадарчым — змушана будзе ў першую чаргу вырашыць справу транзыту шляхом Немана—дзеля павялічэньня транзытных даходаў, чаго, ведама-ж, будуць дамагацца англійскія банкіры, пазычыўшыя грошы Літве. А гэта—ясны шлях да змушэньня Літвы да згоды з Польшчай. А гэта, ведама, цягне за сабой—адмову ад Вільні, ад думкі аб „Вялікай Літве“ і д. п.,—чым усьцяж туманяць галовы літоўскаму народу захапіўшыя ўладу ў краі літоўскія фашысты, адцягваючы яго ўвагу ад яго цяжкога лёсу ды бяздольля.

Што Англія за ўсялякую цану імкнецца да таго, каб пагадзіць Літву з Польшчай, а мо' навет—кінуць Польшчу на Літву—ў разе рашучага апору Літвы, аб гэтым шмат пісаліся ў прэсе. „Кур. Варш.“ даведаўся навет, быццам і цяпер літоўскаму генаралу Зенкавічыўсу ў Лёндане рашуча заяўлена, што пазыка ня будзе забясьпечана Літве, пакуль літоўскі ўрад ня зьменіць свае становішча адносна да Польшчы.

Унутранае палажэньне ў Літве.

Рыжская прэса дае суровае, але праўдзівае, асьвятленьне пануючых палітычных стасункаў ды агульнага гаспадарчага палажэньня ў падбітай фашызмам Літве. Урад усе ніяк ня можа рашыцца аддаць урэшце-ж на „народнае галасаваньне“ свой новы праект канстытуцыі. А гэта—ясна сьведчыць, што — міма пануючага на ўсёй тэрыторыі краю Ваеннага Палажэньня, шалеючай нячувана жорсткай цэнзуры і надзвычайных паўнамоцтваў для адміністрацыі—ўрад усьцяж не пачувае сябе даволі сільным дый зусім ня ўвераны ў тым, што літоўскі народ будзе галасаваць па яго загаду...

Барацьба з апазіцыяй усе больш робіцца цяжэй, а гэта значыць, што апазіцыя ў краі расьце... У працягу 10 месяцаў урад гэтых „таўтінінкаў“, папросту—фашыстаў,—ня здолеў прыцягнуць да сябе ніякаіх сымпатыяў. Панаваньне ў краі „загадаў прэзыдэнта“ замест нармальнай заканадаўчай працы разагнанага парляманту — зрабіў немагчымым абсалютна нікае паразуменьне між урадавай групай і апазіцыяй, якая складае вялізарную большасьць паслоў. Праект новай канстытуцыі, які ўводзіць замест парлямантарнага ўраду, урад, назначаны прэзыдэнтам ды адказны перад ім-жа, канчальна парваў усялякую сувязь фашыстаўскай групы з арганізаванымі партыямі краю. Парваны ўсе магчымасьці кампрамісу. Усялякі кампраміс з парлямантам адкідае цалком перадусім фактычна маючая ўсю ўладу ў краі вайсковая група, у руках якой Сьметона ды Вальдэмарас зьяўляюцца толькі лялькамі, якія круцяцца дый гавораць, як ім прыкажа павадыр гэтай вайсковай групы, які фактычна—на свой рыск і страх, але, як кажуць, на англійскія грошы,—зрабіў пераварот.

Гэта палітычна фатальная сітуацыя аслажняецца яшчэ страшэнным гаспадарчым і фінансавым крызісам Літве закрыты замежны (англійскі) крэдыт, пакуль яе ўрад—„ня высьвятліць сваю праграму ў вонкавай палітыцы“, гэта значыць — ня вырашыць пытаньня аб стасунках з Польшчай. Але—душачыся пад цяжкім англійскім „прэсам“, дамагаючымся паразуменьня з Польшчай, з аднаго боку—Літва, з другога боку, пляново націскаецца нямецкім урадам, каб ні за якую цану ня йшоў на гэта паразуменьне з Польшчай, адначасна трэбуючы амаль не адмовы з боку Літвы ад Кляйпэды,—у кожным разе—значных уступак там нямецкаму панаваньню. Літоўскі ўрад круціцца на ўсе бакі, але ўсьцяж што далей то больш руйнуючы край... Раззлаваны апорам яго ў справе Кляйпэды нямецкі ўрад зачыніў толькі што зусім граніцу для ўвозу ў Нямеччыну літоўскага хлеба ды быдла, задаўшы гэтым цяжкі ўдар літоўскай краёвай гаспадарцы...

Наагул, стасункі ў Літве зрабіліся настолькі цяжкімі дый так шпарка пагаршаюцца ўсьцяж, што—калі ня будзе якой рашучай перамены, дык — павінна наступіць катастрофа... Як яна пойдзе, ці шляхом унутранага выбуху ці неяк прыйдзе звонку, цяжка сказаць...

„Вільня—сталіца Літвы“—ня вычыркнута з літоўскай канстытуцыі...

Урадавае Літоўскае Агенцтва афіцыяльна запярэчвае вестку, паданую французскай прэсай, быццам літоўскі ўрад—пад націскам англійскай і французскай дыпляматыі — згадзіўся вычыркнуць у сваім праекце новай канстытуцыі Літоўскай Рэспублікі той артыкул, які кажа аб — Вільні, як сталіцы Літвы... Літоўскі народ, галасуючы ў справе гэтай канстытуцыі, мае „вырашыць“ сам гэтую справу... на паперы...

Адначасна літоўскае агенцтва запярэчывае і таму, быццам англійскі і французскі паслы націскаюць на літоўскі ўрад, каб той—узяў назад сваю скаргу на польскія гвалты, паданую ў Лігу Народаў...

„Надзвычайныя паўнамоцтвы“ для старостаў у Літве.

Урад літоўскіх фашыстаў надзяліў сваіх „начальнікаў паветаў“ — надзвычайнымі паўнамоцтвамі—для барацьбы з узрастаючай апазіцыйнасьцяй проці ўраду шырокіх сялянскіх масаў...

Апраўданьне забойцы Петлюры Шварцбарда.

У парыжскім судзе ў працягу шмат дзён ішоў працэс аб забойстве нейкім Шварцбардам ведамага „атамана Украіны“ Петлюры, які, здаецца, ў паразуменьні з марш. Пілсудскім меў намер даканаць „незалежнасьці Украіны“—ў фэдэрацыі з Польшчай. Як ведама, падобную-ж думку меў марш. Пілсудскі адносна да Беларусі, пазыскаўшы сабе ведамага „бацьку Балаховіча“. Як ведама, абодва „атаманы“ — ўкраінскі ды беларускі, апрача ўсяго іншага, уславіліся—жыдоўскімі пагромамі на Украіне і Беларусі. Водгукам гэтых пагромаў быццам і зьявілася забойства Петлюры ў Парыжу абвінаваченым Шварцбардам. Ён даводзіў на судзе, што памсьціўся за тысячы забітых ды замучаных яго радакоў ды крэўных на Украіне. З свайго боку, пэўныя колы ўкраінскай эміграцыі, блізкія за забітага Петлюры, цьвердзяць, што забойства „атамана“ было арганізавана праціўнікамі палянафільскай палітыкі Петлюры, які—ад часу здабыцьця ізноў улады ў Польшчы марш. Пілсудскім—мог, можа, ізноў адыйграць нейкую ролю ў гісторыі Украіны... Дык быццам Шварцбард быў выкарыстаны гэтымі коламі дзеля—„ўхіленьня Петлюры.

Суд, пасьля доўгага разгляду справы, у часе якой высьветлілася запраўды ж жудасны абраз „пагромных часоў“ на Украіне, зьвязаных неяк з імем Петлюры,—вынес забойцы—апраўдальны прысуд.

Гэты праўны апраўдальны для забойцы прысуд французскага суду прысяжных („суду народнага сумленьня“, як называюць суд прысяжных) зьяўляецца—пэўна-ж палітычным абвінавальным прысудам для забітаго Петлюры.

Нацыянальнае адраджэньне Турцыі.

Палітычная дэклярацыя прэзыдэнта Турэцкай Рэспублікі Кэмаля-пашы, прачытаная ім на кангрэсе людовай партыі і прынятая кангрэсам, разьвівае цэлую шырокую праграму нацыянальнага, культурнага і палітычнага адраджэньня Турцыі. Дэклярацыя кажа, што новая Турцыя павінна быць пабудавана на падставе сучаснай эўрапэйскай цывілізацыі і дэмакратычнага і рэспубліканскага ладу.

У асьветнай палітыцы трэба тасаваць сыстэму—нацыянальнай, але зусім сьвецкай школы—адзінага тыпу для ўсяго насяленьня. Далей дэклярацыя сьцьвярджае, што галоўная небясьпека для далейшага ўтрыманьня цэльнасьці дзяржавы, гэта — фінансавы крызіс, які трэба перамагчы — суадказнай палітыкай бюджэтнай эканоміі і фінансавых рэформаў. Дэклярацыя ўказывае на вельмі значныя паступы ды пасьпехі краю пад рэспубліканскай уладай — у-ва ўсіх галінах яго дзяржаўнага жыцьця.

Ізноў спроба паўстаньня ў Гішпаніі.

Дыктатарскія „жонды“ ген. дэ-Рывэры, ня гледзячы на старшэнныя рэпрэсіі, усьцяж выклікаюць паўстанчыя выбухі з боку трацячага цярплівасьць народу. Ня глядзячы на шчыльную цэнзуру ў краі, французскія крыніцы даведаліся — аб новым выбуху паўстаньня ў тэй-жа найбольш рэвалюцыйна настроенай Каталеніі, якой насяленьне, ня лічучы сябе навет гішпанцамі, усьцяж дамагаецца—ня толькі аўтаноміі, але і—поўнай незалежнасьці ад Гішпаніі... Праўдзівасьць вестак аб паўстаньні пацьвярджаецца вострымі ваеннымі мерамі французскіх уладаў на гішпанскай (каталенскай) граніцы...

Паўстаньні ў Мэксыцы ня спыняюцца.

Паўстаньні, аранізаваныя ці то амэрыканскімі агентамі ці ваяўнічым клірам, якi ўсяцяж вядзе барацьбу ды падбурае насяленьне — каб адабраць назад канфіскаваныя сацыялістычным ўрадам царкоўныя землі — на карысьць зямельнай рэформы,—у Мэксыцы, ня спыняюцца. Апошні раз атрады паўстанцаў напалі 24-га кастрычніка на ўрадавыя войскі пад самай сталіцай Мэксыкі, прычыніўшы ім вялікія страты. Урадавыя войскі змушаны былі пакінуць займаныя пазіцыі. Камандзір урадавых войскаў ген. Агвірэс ледзь унёс жыцьцё.

Падарожа польскага пасла па Крыму і Украіне.

Польскі пасол Патэк з Каўказу, дзе пэўны час жыў, карыстаючыся жыватворнымі мінэральнымі водамі для курацыі, паехаў морам у Крым. Там у Сымфэропалі быў урачыста прыняты ўрадам Крымскай Рэпублікі. Адтуль, аглядзеўшы новапаўстаўшыя жыдоўскія калёніі, паехаў Дняпром у Украіну.

Як там з матурай.

Ня раз ужо і польская, а пераважна беларуская прэса разьбірала пытаньне аб наданьні матуры беларускім школам. Абгаварывалася пытаньне гэта з розных бакоў. Але ж з усей гэтай пісаніны відаць было, што адмову публічных правоў беларускім сярэднім школам урад абсноўвае на тым, што: 1) беларускія сярэднія школы стаяць на нізкім роўні ў сэньсе выпаўненьня праграмы навучаньня і 2) што беларускія школы зьяўляюцца „рассаднікам камунізму“.

Што тычыцца апошняга аргумэнту — дык ён па крысе пачынае заняпадаць пасьля таго, як стала высьвятляцца, што закід гэты зьяўляецца ня толькі беспадстаўным, але зусім ня сур'ёзным, проста сьмешным. Бо і праўда, як можа трымацца такі закід у працягу некалькіх гадоў, калі за ўвесь гэты час польскія ўлады бясьпечнасьці так старанна нішчаць усякія пачаткі камунізму і „камунізму“ на нашых землях.

А між іншым мусім адзначыць, што за 8 гадоў існаваньня хоць-бы сабе Віленскай Беларускай Гімназіі ўлады—грамадзкае бясьпечнасьці — у Польшчы ня выкрылі ў ёй ані воднае праявы камуністычнай працы. І гэта ў той час, калі, судзячы па польскай прэсе, арыштоўваюцца камітэт за камітэтам камуністычнае прапаганды. Ня раз чытаеш у польскай прэсе, што гэтыя камуністычныя работнікі не пасьпеюць яшчэ распачаць працы, як апыняюцца ўжо на Лукішках, дзякуючы здатнасьці, як кажа тая-ж прэса, польскіх уладаў бясьпечнасьці. Цікава, чаму-ж тады спрытнасьць польскай паліцыі ня можа праявіцца да „камуністычнай працы“ беларускіх сярэдніх школ, аб якой гаворыцца ўжо ў працягу некалькіх гадоў? Ці беларускія сярэднія школы карыстаюцца экстэрыторыяльнасьцью? Хіба што не, бо, калі навет пасольская нятыкальнасьць не зьяўляецца перашкодай у працы польскіх уладаў бясьпечнасьці — дык што-ж гаварыць аб беларускіх школах, аб гэтых зусім прыватных установах? І што-ж трэба канстатаваць, што да гэтага часу польская ўлада ня можа прывясьці ніводнага факту, на аснове якога можна было-бы абвінавачаваць беларускія сярэднія школы ў пашырэньні „камунізму“. Вось чаму закід № 2 пачынае траціць свой "raison d'être„ (сэнс існаваньня).

Што тычыцца першага закіду, гэта, што беларускія сярэднія школы знаходзяцца на ніжэйшым роўні, што да выкананьня праграмы — дык гэты закід застаецца важным у польскіх колах і надалей. Але аб ім мы яшчэ пагаворым. Цяпер-жа я хачу спыніцца на іншай справе, гэта адносна шкоднасьці для Польшчы таго факту, што беларускія сярэднія школы ня маюць правоў. Шкоднасьць гэтага факту ня раз ужо падкрэсьлівала польская прэса, асабліва „Kurjer Wileński“. І зразумелая рэч, што шкода ў гэтым ёсьць: Паўстаюць ненармальныя адносіны паміж беларускай нацыянальнасьцяй і польскай, на якую беларусы глядзяць, як на ўпрывіляваную, моладзь наша мусіць пакідаць родны край, цягнучыся за вышэйшай асьветай заграніцу, дзе, як кажа той-жа „Kur. Wil.“, набіраецца духу варожага да Польшчы; разам з тым край пазбаўляецца новых, маладых, творчых, асьвечаных беларускіх сіл. Усё гэта слушна; мы-б з свайго боку маглі дадаць яшчэ, што шкода для беларускай справы ёсьць і ў тым, што моладзь гэта, выехаўшы заграніцу **або зусім не варочаецца назад** (калі яна едзе на ўсход), **або, калі і вернецца з чужымі дыплёмамі, дык ня можа ўзяцца за працу, бо-ж дыплёмы гэтыя польскай уладай не прызнаюцца.** А настрыфікаваць іх вы думаеце лёгка? Ого, папрабуйце, пабачаце, што Вам скажуць трымаць польскую матуру перш за ўсё, а там можа ўжо толькі пачнуць з Вамі гутарыць аб настрыфікацыі (прызнаньні). Дык каму-ж найбольшая шкода ў гэтым, паляком ці беларусам? Ясна, што ў першую чаргу нам, бела-

---

— Пабойцеся вы Бога, сусед! Вы-ж, здаецца, нешта такое вінаваты былі жыду. Вось зьвярнулі-б... Даль-Бог, трэба нам трохі аддаць.

Але сусед адказываў:

— А чаму я маю яшчэ аддаваць, калі я яму сваімі рукамі ўсе грошы прынёс да астатняга грошыка? Другі раз буду плаціць, ці што? Вось вы, сусед, другі інтэрас...

— Чаму гэта другі інтэрас, калі якраз той самы, як і ваш? Хутка да ад'езду прыйшоў да мяне Янкель, ды як пачаў прасіць: „аддай, ды аддай, — я і аддаў“.

Млынар ўсё гэта чуў, і ў яго балела сэрца... Эх, які народ! Ні трохі не баяцца Бога! Ну, панове — грамада, пры вас дрэнна нельга палажыць, — якраз забярэце; ды і хто вам дасьць палец у зубы, той чысты дурань!... Не, ужо ад мяне не дачакаецеся... Вы мне гэтак у міску ня плюнеце. Ляпей я сам вам наплюю...

Адна толькі старая Параска прынясла жыдоўцы два дзесяткі яек, ды палавіну навіны, і аддала за некалькі грашэй, што асталася вінавата Янкелю.

— Бяры, нябога, не сярдуй. Засталося за мною яшчэ некалькі, дык аддам, як Бог дасьць. Астатняе і то прынесла.

— Вось подлая баба! — узлаваўся млынар. Учора мне не аддала, а жыдоўцы знайшла. Але-ж і народ! Старым і то верыць ня можна. Хрышчонаму чалавеку не магла аддаць... Пачакай, старая, разьлічуся я з табою пасьля...

Нарэшце пазьбірала Янкеліха сваіх бахуроў, прадала за бэзцэн „бэбэхі“ і водку, якая засталася, — а засталося яе мала. (Янкель хацеў бочку прывязьці з места), ды яшчэ казалі, што Харко нацадзіў сабе з рэштак вядро — другое, — і пацягнулася пехатою з Новай-Каменкі. Бахуры, за ёю... Двух нясла на руках, трэці цягнуўся, схапіўшы падол спадніцы, а двух старэйшых беглі, падскаківалі...

І зноў скраблі грамадзяне свае патыліцы. У каго яшчэ было сумленьне, дый той думаў сабе: „Каб даць на фурманку за жыдоўскія грошы“... Але вось, бачыце, кожны баяўся: тады ўжо людзі даведаюцца, што яшчэ ён не разьлічыўся з жыдам. А млынар ізноў думаў: „Ну і людзі! Вось гэтак сама і мяне будуць старацца збыць, калі я дам маху“.

Гэтак бедная ўдава пацягнулася ў места, і ўжо Бог ведае, што там з ёю дзеецца. Можа і прыліпла з дзяцьмі да якога небудзь гандлю, а можа ўсе пачэзьлі з голаду. Усё можа быць! А, ў кожным выпадку, жыды свайго не пакінуць. Дрэнна, але-ж дадуць магчымасьць як небудзь пражыць на сьвеце.

Пасьля гэтага пачала грамада радзіцца, хто цяпер у іх, Новай-Каменцы будзе карчмаваць? Бачыце, хоць Янкеля і ня было, а карчма ўсё-ж стаяла на прыгорачку і на дзьвярох засталіся намалёваны белаю хварбаю кварта і бляшаны кручок...

І навет Харко сядзеў сабе на прыгорачку і курыў люльку, чакаючы каго Бог пашле яму ў гаспадары.

Праўда, адзін раз пад вечар, калі грамадзяне стаялі каля пустой карчмы і радзіліся, хто цяпер будзе ў іх карчмарыць,—падышоў да іх бацюшка і, нізенька пакланіўшыся ўсім (грамада — вялікі чалавек, перад грамадой ня грэх кланяцца і бацюшцы), пачаў гутарку аб тым, што было б добра, каб напісаць прыгавар і зачыніць карчму на векі вечныя. Ён, бацюшка, навет, і паперу сваёй рукою напіша і пашле яе да найасьвячонейшага. І было-б вельмі добра, весела і прыгожа.

Старыя людзі, а за старымі і кабеты, пачалі гутарыць, што бацюшка кажа чыстую праўду, а млынару гэта падалося няпраўдаю, а навет крыўдаю.

„Вось табе і бацька, — падумаў ён злуючы, — вось табе і прыяцель! Але пачакай пан-айцец, што будзе“...

— Гэта такі, бацюшка, ваша праўда, — соладка загаварыў ён, — што ад тае паперы будзе добра... А толькі, я ня ведаю, каму: грамадзе, ці вам. Вы, напрыклад, выбачце мне маё слова! — заўсёды гарэлку прывозіце з места, вам карчма не патрэбная. Але і гэта вам у руку, што сам уладыка будзе чытаць вашу паперу, ды хваліць...

Грамадзяне ўсьміхнуліся сабе ў вусы, а бацюшка з вялікай прыкрасьці толькі плюнуў, нацягнуў саломены капялюш і пашоў ад шынку па вуліцы, быццам і ня быў там.

Але што апавядаць. Я думаю вы і бяз гэтага дагадаліся, што млынар задумаў сам карчмарыць у той жыдоўскай карчме. А пастанавіўшы, пагаварыў добра з грамадою, пачаставаў каго трэба ў земскім судзе, пагутарыў разумна з іспраўнікам, потым з казначэем, а пад канец з станавым прыставам і з акцызнікам.

Вярнуўшыся пасьля гэтага ў вёску, пайшоў млынар пад карчму, а там сядзіць Харко і пакурывае люльку. Як толькі млынар матнуў яму галавою, Харко—хоць і ганаровы чалавек, — у той момант скочыў на ногі і прыляцеў да яго.

— Ну, што скажаш? — спытаў у яго млынар.

— А што мне гаварыць? Пачакаю, ці ня скажэце вы чаго-небудзь.

— Але-але!

Не пачынаў ужо цяпер мучыць млынара славамі, а схапіўшы ў дзьве рукі шапку і, выслухаўшы, што яму сказаў Піліп, адказаў разумна:

— Рады старацца для вашай гаспадарскай міласьці!

І пачаў карчмарыць млынар у Нова-Каменцы лепш за Янкеля, пачаў аддаваць на пашу свае карбованцы, а як прыдзе тэрмін,— зьбіраць іх зноў у сваю скрыню, разам з прыплодам. І ніхто ўжо не перашкаджаў яму ў Новай-Каменцы.

А што не разліліся горкія сьлёзы, — ну і гэта праўда. Такі ня мала плакалі: можа ня менш як ад Янкеля, а можа, яшчэ і больш,—гэтага я вам напэўна не скажу. Хто там мерыў мераю людзкое гора, хто пералічыў людзкія сьлёзы...

Ніхто ня мерыў і ня лічыў, а старыя людзі кажуць: ідзе ці ходзіць, на адно выходзіць, што клюкаю, што палкаю—усё карку ня соладка. Ня ведаю, як каму, а мне здаецца, што гэта праўда...

(Далей будзе).

русам, вось сэкрэт! А кожны хоць крыху грамадзка думаючы чалавек мусіць згадзіцца, што Польскай Дзяржаве, як такой ад гэтага робіцца таксама вялікая шкода, калі глядзець з пункту гледжаньня дзяржаўнасьці наагул, прыймаючы пад увагу, што Дзяржава Польская складаецца ня толькі з палякоў, але і з іншых народнасьцяў, якія хоць і прадстаўляюць меншасьць, але зьяўляюцца значнай часткай грамадзянства, як такая, ня могуць быць адсунуты ад дзяржаўнага і грамадзкага жыцьця Польшчы.

Бяда толькі ў тым (і ня толькі для нас), што абсалютная большасьць польскага грамадзянства глядзіць на гэту справу інакш. Апіраючыся на тэй-жа польскай прэсе, можна судзіць, што польскае грамадзянства лічыць толькі сябе поўнаўласным гаспадарам дзяржавы і ўсіх яе краін, незалежна ад таго, якая нацыянальнасьць творыць большасьць у тэй ці іншай краіне. З гэтага пункту гледжаньня трактуе большасьць польскага грамадзянства і беларускае школьніцтва наагул і сярэднія беларускія школы асобна. Яна лічыць, што гэта добра, што наша моладзь ня мае доступу да вышэйшых школ у межах Польшчы, прымаючы слабейшым будзе беларускі нацыянальна і культурна-адраджэнскі рух і што ў такім выпадку будзе лягчэй з ім змагацца; добра, што нашы матурысты выяжджаюць за граніцу, тым менш беларусаў у Польшчы, тым лепш, тым больш сьвядомых і асьвечаных беларусаў.

А на аснове тэй палітыкі, якую вядзе ў адносінах да нас і да нашых сярэдніх школ польскі ўрад, можна думаць, што ці ня так толькі і ён глядзіць на нас і на нашы школы, як і ўспомненае польскае грамадзянства. І нічога ня было-б дзіўнага, калі-б было так, бо ўрады-ж усе вядуцца з польскага грамадзянства.

Дык тады ня ў вышэйупомненых закідах трэба было-бы шукаць прычын таго, што нашы сярэднія школы ня маюць да гэтага часу публічных правоў, а трэба было-б шукаць іх глыбей, іменна ў адносінах польскага ўраду да нас і да нашага адраджэнскага руху.

І сапраўды, калі-б Урад хацеў шчыра адносіцца да пытаньня аб наданьні правоў нашым сярэднім школам—дык пытаньне гэта даўно ўжо было-бы вырашана дадатня і ня было-бы закідаў, што нашы сярэднія школы стаяць на „нізкім позёме".

Калі-б навет і было праўдай і тое, што нашы школы стаяць на ніжэйшым роўні — дык таксама навет было-бы зразумелым, прыняўшы пад увагу тыя варункі, у якіх знаходзяцца гэтыя школы: ні дапамогі, ні субсыдыяў з боку польскага ўраду яны не атрымліваюць, вучыцялі жывуць проста ў прагаладзь і калі да гэтага часу ня спыніюць сваей ахвярнай працы, дык дзякуючы сваей высокай ідэйнасьці. А ня трэба забывацца, што і вучні нашых сярэдніх школ прадстаўляюць сабой самы бедны элемэнт. Але ляжачага ня б'юць, а падымаюць — кажа прыказка (што праўда, то мы яшчэ не ляжым). Дык і польскі ўрад, калі-б захацеў шчыра падыйсьці да вырашэньня пытаньня аб матуры, не рабіў-бы нам закідаў, што мы слабыя, а дапамог-бы нашым школам так, як і польскім памагае і так даў-бы магчымасьць нашай моладзі ўступаць у польскія вышэйшыя школы.

Але, як відаць, гэтага шчырага падыходу да гэтае справы польскі ўрад ня мае да гэтага часу. Колькі пісалася аб тым, што Навагрудзкая гімназія атрымала публічныя правы! Аж аказалася, што толькі тры першыя клясы маюць правы. І чаму Навагрудзкая гімназія? Бо што тычыцца „позёму" і кваліфікацыяў вучыцялёў, дык Навагрудзкая гімназія стаіць найгорш. Хіба таму атрымала яна правы, што найменш беларуская з усіх існуючых беларускіх гімназіяў.

Дык зразумелая рэч, што мы мусім кінуць ілюзіі аб тым, што нашы сярэднія школы атрымаюць тады толькі правы, як польскія ўлады сьцьвердзяць, што дайшлі яны да „належнага позёму". Хіба, што тады нашы сярэднія школы атрымаюць правы, як зьменіцца палітыка ў адносінах да нас. А калі яна зьменіцца і як зьменіцца, невядома. Дык невядома і з матурай для нашых матурыстаў.

Матурыст.

Да ведама усіх дэклярантау, склаушых у 1926 г. дэклярацыі на урадовыя беларускія школы.

Як толькі будзе пададзена афіцыяльнае паведамленьне школьнага Куратара (ў гміне) аб адмове адчыніць урадовую беларускую школу, дэкляранты, якія складалі ў 1926 г. дэклярацыі на адчыненьне ўрадовай беларускай школы, мусяць зараз-жа, не пазьней як ў працягу 14 дзён ад дня паведамленьня, злажыць жалабу Міністру Асьветы ў Варшаву, папольску, паводле прыкладзенай формы, а ў Галоўную Управу перасылаць копію гэтае жалабы. Жалаба да Міністра мусіць быць падпісана дэклярантамі. Подпісь сьцьвярджаць ня трэба.

Do Pana Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego.

Obywatele wsi . . . . gminy . . . . pcwiatu . . . .

ZAŻALENIE.

Korzystając z prawa, przysługującego nam na podstawie § 12 Rozporządzenia wykonawczego Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego z dnia 7.I-1925 r. do Ustawy Językowej Szkolnej z dnia 31.VII-1924 r. niniejszym zanosimy Panu Ministrowi zażalenie co do decyzji p. Kuratora Okręgu Szkolnego . . . . od dnia . . . . Nr . . . . w sprawie języka nauczania we wsi . . . . gminy . . . . pow. . . . .

Według ogłoszenia, po badaniu p. Inspektora Szkolnego powiatu . . . . . . złożonych w swoim czasie deklaracji szkolnych na . . . . dzieci, uznano za ważne deklaracji na . . . . dzieci, resztę unieważniono, jakoby z tego powodu (указаць, на які лік дзяцей Куратар уняважніў дэклярацый і прычыны ўняважненьня). Unieważnienie to liczymy za nieprawne (указаць прычыны, дзеля якіх лічыце ўневажненьне незаконным).

Na podstawie powyższego prosimy Pana Ministra otworzyć szkołę rządową w bieżącym roku szkolnym we wsi . . . . gminy . . . . powiatu . . . . z językiem wykładowym ojczystym — białoruskim.

Dnia.................... 1927 r. (Подпісы).

Наша хроніка.

Справа „Грамады". Як паведамляе „Słowo", орган п. міністра справядлів. Мэйштовіча, сьледзтва ў справе Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады ўжо „аканчальна закончана" і ў хуткім часе будзе даручаны акт абвінавачаньня. Сьледзтва вялося ў 5-х судов. акругах: Віленскай, Навагрудзкай, Беластоцкай, Горадзенскай і Пінскай. Абвінавачваецца 490 асоб, прычым толькі з аднае Вільні—110, у гэтай лічбе паслы—Валошын, Мятла, Рак-Міхайлоўскі і Тарашкевіч, а таксама Астроўскі і Луцкевіч. З боку абвінавачаньня выклікаецца аж 1.000 сьведкаў. Аб ліку сьведкаў абароны орган п. міністра справядлівасьці нічога не паведамляе.

Як відаць з гэтых інфармацыяў „Słowa", гэта будзе найвялікшы палітычны працэс у Польшчы ды мо' быць і ў цэлым сьвеце! Не прыпамінаем сабе ў гісторыі навейшых часоў падобнага „монстр-працэсу".

Сьвяткаваньне 10-х угодкаў існаваньня беларускай сярэдняй школы. У аўторак 1-га лістапада у будынку Віл. Гімназіі адбылося сьвяткаваньне 10 х угодкаў існаваньня бел. сярэдняй школы, якое насіла вельмі ўрачысты характар. Падробную справаздачу аб прабегу ўрачыстасьці дамо ў наступным нумары.

Драматычная сэкцыя Цэнтральнага Гуртка Т-ва Бел. Школы пад кіраўніцтвам вопытнага артыста-рэжысёра грам. А. Міхалевіча распачала сваю працу. Трупа фармуецца і папаўняецца новымі сіламі.

У суботу 5 і ў нядзелю 6 гэтага лістапада ў 8 гадз. вечары адбудуцца дзьве вечарыны, у памяшчэньні Народн. Дому пры Гал. Управе Т-ва Б. Ш. (вул. сьв. Ганны 2-3). Пастаўлена будзе драма: „Дзядзька Якуб"— у 2-х актах Францішка Аляхновіча і дывэртысмэнт. У спэктаклю прымае ўдзел вядомы мастак грам. М. Замэцкі. Пасьля спэктаклю скокі. Уваход выключна па запросінах.

Праявы перадвыбарнай кампаніі. Як паведамляе польская прэса, нова-створаная „беларуская радыкальная партыя", пад кіраўніцтвам правакатара Гурына і Умястоўскага высунула і радыкальную праграму: 1) зямля бяз выкупу, 2) пратэст проці асадніцтва, 3) пратэст проці дзейнасьці Паўлюкевіча. У гэтым кроку відаць спрактыкаваную руку, якая ў часе выбарнай кампаніі задумала такою праграмаю справакаваць беларускае сялянства.

Але залішне белымі ніткамі шыта, панкі, дый сьвядомасьць сялянства завельмі вялікая, каб вам гэтая правакацыя ўдалася. На „зьезьдзе", як паведамляе „Słowo", было 28 асоб, з якіх 10 было з самой Вільні.

Што прымусіла? У апошнім нумары „Сялянскай Нівы" зьявілася стацьця („Першы крок") аб выбарнай акцыі. Тут знаходзім вельмі цікавы зварот па адрасу прыхільнікаў „Нашай Працы", прапануючы ім супольны выбарны блёк з „Сельсаюзам" і Хадэцыяй. Фармальна гэтую сваю прапазыцыю газэта мартывуе наступным парадкам: „добры дзесятак" беларускіх і польскіх партыяў будуць заманіваць беларускае сялянства, — „каб на яго сьпіне вывезьці сваіх кандыдатаў да пасольскіх мандатаў" — далей крыху—„калі пачнуць скубаць яго і калі вырвуць па адной ды па другой пярынцы, дык, ясна, падушкі ня будзе".

Па-першаму — ніхто з абаронцаў працоўных гушчаў аб „падушках не стараецца, па-другому — няўжо-ж, вы, паночкі, так запраўды думаеце, што беларускае сялянства гэткае несьвядомае і так не з'арганізавана, што пойдзе быля за кім, ці-ж дагэтуль яшчэ гэты факт высьлізгоўвацца з вашага кругазору?

Што гэта прымусіла Вас, панкі, пасьля бруду, інсынуацыяў, даносаў, на кшталт „Чужацкіх агентаў", ды іншых прыгожых рэчаў — раптам гутарыць з прыхільнікамі „Н. П.", як з запраўднымі „выявіцелямі інтарэсаў і жаданьняў беларускага народу".

Цікава!...

Ахвяры пацярпеўшым ад стыхійных няшчасьцяў. Атрымана ад грам. вёскі Еськаўцы Косаўскага павету — 26 зл.

× Атрымана ад артыстаў-аматараў м-ка Далятычы—10 злотых.

Камітэт Помачы складае ахвярадаўцам шчырую падзяку.

Агалошаньне. Нас просяць апублікаваць, што ў в. Пабрэзьзе, Негнявіцкай гміны, Навагрудзкага павету прапаў чатыры месяцы назад з выгану конь шасьці гадоў, каштановай масьці, кароткія грыва і хвост, на задняй левай назе вялікая рана ад пакусу ваўком.

Хто паведаміць аб ім на імя Б. Петракевіча ў вышэй паказаную вёску, дастане сто (100) злотаў.

Карэспандэнцыі.

На чорную дошку.

(в. Загор'е, Слонімскага пав.).

Шкадую, што прыходзіцца мне пісаць пра сумныя зьявішчы нашае вёскі і высьвятляць у чорнай фарбе людзей, якіх мы лічылі калісьці за сваіх. Але мушу вывесьці „на чыстую воду" нягодніка і дурня, як наш „дзеяч" Міхал Зенька, які зарабіўшы 100 зл., у лесе, пачаў лічыць сябе ўжо і багатым і „загнуў нос" у другі бок. Уперад, як існавала Грамада, мы злажылі грошы на нашу беларускую газэту, якая акуратна ішла нам да гэтага часу. Карысталіся ёй мы супольна. „Разбагацеўшы" наш здраднік цяпер карыстацца нам адмовіў, а на нашы ўкоры, што газэтка ёсьць нашай агульнай уласнасьцяй, „наш дзеяч" пагразіў данесьці на ўсю вёску Паўлюкевічу, што яна чытае не яго газэту.

Так мы і асталіся на некатары час без сваей газэты, якую мы заўсёды чакалі, як птушка лета.

„Паночак"! Газэтку мы ўсё-ж такі выпішам, а ты данасі ня толькі Паўлюкевічу, але і проста ў дэфэнзыву: мінуліся тыя часы, калі мы гэтага палохаліся. Ганьба табе!

Яўхім Справядлівы.

Чэсьць і ганьба.

(в. Шэні, Пружанскі пав.).

Есьць у нашай вёсцы кавалак адлеглае сенажацьці, якая што-год прадавалася. Грошы гэтыя часамі заставаліся ў кішэні гандляркі Бэйлі, а часамі прападалі бязсьледна іншымі парадкамі. Але ў сёлетнім годзе на гэта прышоў канец. Сьвядомейшыя сяляне зразумелі, што грамадзкія грошы трэба пускаць ня ў бутэльку, не на карысьць розных ліхвяроў ды ашуканцаў, а на асьвету для нашых дзетак.

23 га кастрычніка склікалі сход і грошы ад прадажы сенажаці ў суме 100 зл., парашылі адпусьціць на беларускія школьныя падручнікі для дзяцей (наша школа ўтраквістычная).

Радуючыся, што нашы перадавыя сяляне самі разумеюць свае абавязкі, мушу з больлю адзначыць, што некаторыя, менш сьвядомыя нашы браты, гэтаму пярэчылі. Ім мусіць, хацелася належную ім частку занесьці да Бэйлі. Сорам і ганьба вам, сяляне! А вы, дарагія браты, зразумеўшыя карысьць асьветы для нашае цёмнае старонкі ў роднай мове заслугоўваеце на чэсьць і пахвалу.

Хай ваш добры ўчынак паслужыць прыкладам і для іншых нашых сялян. Тады хутчэй мы зможам нашу цемру і выйдзем у сям'ю культурных народаў.

Басак.

А мы не пашкадуем.

(м-ка Радашкавічы).

Мінула лета, за якім надыйшла халодная і мокрая восень. Бяднейшыя сяляне нашы бядуюць, што мала сабралі сабе з поля харчоў, мала запасьлі корму для сваей скацінкі. З жахам яны чакаюць зімы.

За тое нашы жанчыны з радасьцяй сустракаюць яе. Чаму? Можа, што зімой працаваць ня трэба? Не адсутнасьць на полі зімой работы прымушае радасна біцца сэрца кабет і дзяўчат у Радашкавічах — яны радуюцца, што ня будуць цяпер ганяцца за імі паны Янушэўскія.

Ад м-ка Радашкавічы за 3 вярсты ёсьць маёнтак з лесам Альжбеты Янушэўскай. Бачачы падыход галоднае зімы, нашы дзяўчаткі ў свабодны час прабавалі хадзіць туды па грыбы і ягады. Гэта так раззлавала паню, што яна загадала сваім сынам і лясьнікам iсьці вайной на „зладзеяў", а на дапамогу ім паклікала паліцыю. Вядома, што апошняя стаяла за яе „гарой". І чаму-ж не стаяць, калі яна на кожным шагу „вяшчуе" хутка ўбачыць „Króla", пры якім завядзе яшчэ лепшыя парадкі.

Панечка, табе для галоднага сярмяжніка і твайго кармільца шкада грыбоў і ягадаў, якія гніюць у тваім лесе, дык ад шчырага сэрца жадаем табе хутчэй прыйсьці за імі да нас. Напэўна: не пашкадуем і ў паліцыю цябе як зладзейку не павядзем. Ці можа гэтага не спадзяешся?

Рудабароды.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Гэтым маю гонар прасіць Вас зьмясьціць у паважанай Вашай газэце „Праца", наступнае спраставаньне.

У сельсаюзьніцкай газэтцы „Сялянская Ніва", з 26 кастрычніка с. г., у нататцы пад т.-зв. „Рэзалюцыі канфэрэнцыі Беларускага Сялянскага Саюзу ў Браслаўлі", напісана, што ў канфэрэнцыі прыймала ўчасьце 33-х сяброў Б. С. Саюзу. Аднак гэта нязгодна з праўдай. У названай канфэрэнцыі былі прысутнымі каля 20-ці чалавек з запросінамі, як „сымпатыкі", 3-х, (да якіх і я належаў) хадзілі на тую канфэрэнцыю толькі паглядзець на... кругленькую хфігуру пана пасла Ярэміча, 3-х урадоўцаў і... 5, ці каля гэтага сяброў Б. С. С.

Гэта відавочным стала, пасьля прамовы п. Ярэміча,—якую сяляне назвалі — гарох з капустаю—калі ўсе „сымпатыкі" пакінулі салю канфэрэнцыі і асталіся на салі толькі 5 сяброў, якія і ўхвальвалі рэзалюцыі ды выбіралі (сябе) ў акружны камітэт.

Цікава ведаць, ці п. Ярэміч, прачытаўшы гэтыя радкі, пачырванее, ці не Цікава, ці пачырванеюць тыя, што асталіся да канца за сваіх „правадыроў", якім бракуе праўды?

Але відаць—як кажа беларуская пасловіца:—„Гаршчок сагану робіць загану, але ў абодвух... нешта чорныя".

Стоік.

30. X.—27. в. Азераўцы.

Рэдактар-Выдавец: Р. Аляхновіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.